

# У СВЕТЛАЕ КУПАЛАВА ІМЯ

**17 лістапада 2023 года ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы адбыліся XIV Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні. Па традыцыі ў прадстаўнічай навукова-практычнай канферэнцыі прынялі актыўны ўдзел члены Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Па выніках форуму выдадзены зборнік навуковых прац.**

Фактычна Купалаўскія чытанні маюць міжнародны статус, – у іх рабоце традыцыйна прымаюць удзел навукоўцы з-за мяжы. У гэтым годзе імі сталі філолагі з Расіі, Кітая і Узбекістана. З прывітальным словам да ўдзельнікаў




форуму звярнуліся рэктар ГрДУ імя Янкі Купалы Ірына Кітурка; дырэктар-галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда», старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксандр Карлюкевіч; старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Людміла Кебіч *(на фота)* і інш. Была адзначана найважнейшая асветніцкая

місія, якую выконваюць у Беларусі спадчына вялікага Песняра і яе навуковыя даследаванні. Яны, дарэчы, маюць на Гродзеншчыне багатыя традыцыі, і нездарма галоўная вышэйшая навучальная ўстанова Прынёмання з гонарам носіць імя класіка айчыннай паэзіі. Удзел літаратараў у навуковай рабоце таксама бачыцца заканамерным, таму што сапраўдная культура магчымая толькі ў адзінстве навукі, адукацыі і мастацтва. Плённае ўзаемадзеянне творчай і навуковай думкі спрыяюць гарманічнаму развіццю, узбагачэнню духоўнага патэнцыялу Беларусі і беларусаў.

Загучала Слова народнага паэта-класіка. Адкрылася мерапрыемства кранальна і сімвалічна – песняй на словы Янкі Купалы, якую выканаў студэнт універсітэта Іван Вайтовіч. Вершы ўласнага сачынення прачыталі Людміла Кебіч, а таксама госць з Мінска, доктар філалагічных навук, загадчык цэнтра філасофіі, літаратуры і эстэтыкі Інстытута філасофіі НАН Беларусі Валерый Максімовіч.




Пасля пленарнага пасяджэння другім актам у праграме XIV Рэспубліканскіх Купалаўскіх чытанняў сталі секцыйныя выступленні з дакладамі. Прыемны факт: традыцыйна ўдзельнікамі Купалаўскіх чытанняў становяцца студэнты-купалаўцы, юныя даследчыкі. Агучаныя навуковыя працы змешчаны ў зборніку. Ад Саюза пісьменнікаў Беларусі аўтарамі даследчых прац сталі: старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксандр Карлюкевіч; кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы, літаратурны крытык Аліна Сабуць (сёлетні лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі ў намінацыі «Літаратурная крытыка і літаратуразнаўства»); кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы, літаратурны крытык, фалькларыст Руслан Казлоўскі; старшы выкладчык кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы, літаратурны крытык Святлана Тарасава; член Саюза пісьменнікаў Беларусі, краязнаўца Святлана Кошур; галоўны спецыяліст Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык.

Тэматычны спектр выступленняў быў вельмі шырокім. Як сказана ў анатацыі да выніковага зборніка, «у артыкулах асэнсоўваецца спадчына народнага паэта Беларусі Янкі Купалы, асвятляюцца актуальныя праблемы літаратуразнаўства і мовазнаўства». Пералічым тэмы апублікаваных даследаванняў, аўтары якіх прадстаўляюць нашу пісьменніцкую арганізацыю.

- *Карлюкевіч А. М.* Пераклады паэзіі Янкі Купалы на мовы народаў Расіі ў XXI стагоддзі.
- *Кошур С. А.* Памятны фотаздымак з Янкам Купалам беларускіх студэнтаў у Празе.
- *Максімовіч В. А.* Канцэптуальна-аксіялагічныя дамінанты ў паэзіі Янкі Купалы пачатку XX стагоддзя.
- *Сабуць А. Э.* Некаторыя штрыхі да псіхалагічнага партрэта Янкі Купалы (з мемуарнай і эпісталярнай спадчыны).
- *Казлоўскі Р. К.* Мастацкая адметнасць мініяцюры ў прозе Змітрака Бядулі.
- *Радзівончык Дз. М.* Пафас народнасці ў лірыцы Людмілы Кебіч (на прыкладзе зборніка «Мае начныя бліскавіцы» (2023)).
- *Радзівончык Дз. М.* Кніга Аліны Сабуць «Літаратурныя дыялогі: мастацкія пошукі беларускай літаратуры XX-XXI стагоддзяў як артэфакт «звышлітаратуры».
- *Тарасава С. М.* Ролева-маналагічная разнавіднасць паэмы ў творчасці сучасных беларускіх пісьменнікаў.

Натхнёныя несмяротным вобразам Янкі Купалы мы выказваем шчырую ўдзячнасць арганізатарам XIV Рэспубліканскіх Купалаўскіх чытанняў за магчымасць рэалізацыі навукова-асветніцкага патэнцыялу айчыннай літаратуры, яе мінулага і сучаснасці.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**

**На фота:** падчас XIV Рэспубліканскіх Купалаўскіх чытанняў. ГрДУ імя Янкі Купалы. 17 лістапада 2023 года. *(Выкарыстаны фота з сайта grsu.by і партала ВД «Звязда»).*





У відэафармаце да ўдзельнікаў і арганізатараў Купалаўскіх чытаняў звярнуўся дырэктар-галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда», старшыня СПБ Аляксандр Карлюкевіч



Адзін з арганізатараў Купалаўскіх чытаняў, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы Алена Садоўская




**Сярод удзельнікаў навуковага форуму – прадстаўнікі Саюза пісьменнікаў Беларусі**







**У гонар Янкі Купалы – аўтарскі верш ад Людмілы Кебіч**




GRSU.BY


«Пад светлым іменем Купалы»
ЯНКА КУПАЛА
ЯНКА КУПАЛА
ЯНКА КУПАЛА
КУПАЛА
GRSU.BY






**Бібліятэка Купалаўскіх чытанняў**




**З дакладам выступае кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі ў намінацыі «Літаратурная крытыка і літаратуразнаўства» Аліна Сабуць**



**З госцем з Мінска, доктарам філалагічных навук, загадчыкам цэнтра філасофіі, літаратуры і эстэтыкі Інстытута філасофіі НАН Беларусі Валерыем Максімовічам**

